Чацвер, 17 Верасень 2020

Віцябляніна Малахоўскага могуць абвінаваціць ва ўжыванні гвалту да супрацоўніка міліцыі

Друкаваць (/news/zatrymanni/item/3742-gvalt-da-supratsounika-mus?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=f34064a20aac5ce03cba0c28a6c3a329bed73374)

Ацаніць гэты матэрыял (1 голас)



(/media/k2/items/cache/94115c7f7a9e1bb99843d6b5f7c1b50c_XL.jpg)

Падчас затрыманняў 13 верасня

Віцяблянін Уладзімір Малахоўскі ад 13 верасня знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ). У сераду 16 верасня яго судзілі за ўдзел у несанкцыянаваным шэсці (ч.1 арт. 23.34), але на волю не выпусцілі: мужчыну зноў затрымалі па падазрэнні ва ўчыненні крымінальнага злачынства – да выстаўлення абвінавачання. Выставіць яго мусяць праз 72 гадзіны.

“Мы ўжо дакладна ведаем, што Уладзіміра Малахоўскага могуць абвінаваціць ва ўжыванні альбо пагрозе ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка міліцыі – паводле арт. 364 КК. З мужчынай працуюць адвакаты”, – паведамілі нам віцебскія праваабаронцы.

Сваякі **Уладзіміра Малахоўскага** расказалі, што суд паводле адміністрацыйнага артыкулу 23.34 (за ўдзел у несанкцыянаваным шэсці 13 верасня ў Віцебску) быў выязным і прайшоў на тэрыторыі ізалятару. Справу разглядала суддзя **Вераніка Барысава**. Яна прызнала Малахоўскага вінаватым і пакарала штрафам (памер ўдакладняецца).

> Па словах сваякоў, інфармацыя пра тое, што ў Малахоўскага быў зафіксаваны пералом рукі пасля сутычкі з міліцыяй, не пацвердзілася. Аднак маюцца пашкоджанні двух пальцаў на руке. Пры гэтым Уладзімір мае інваліднасць 3-й групы, ён хварэў на анкалогію.

Уладзімір Малахоўскі быў затрыманы 13 верасня падчас мірнага шэсця ў Віцебску. Відэа сутыкнення (https://vk.com/wall-38905579_2719954) змешчыныя ў інтэрнэце.

Артыкул 364 КК прадугледжвае пакаранне арыштам, альбо абмежаваннем волі на тэрмін да 5 гадоў, альбо пазбаўленнем волі да 6 гадоў.

Зміцер Міраш

Апублікавана ў Затрыманьні (/news/zatrymanni)

Тэгі: артыкул 364 КК (/itemlist/tag/артыкул%20364%20КК) ІЧУ (/itemlist/tag/ІЧУ) артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП) Уладзімер Малахоўскі (/itemlist/tag/Уладзімер%20Малахоўскі)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Студэнты вэтакадэміі ў Віцебску сталі ў ланцуг салідарнасьці. Двух хлопцаў затрымалі (/news/zatrymanni/item/3732-dvukh-khloptsau-zatrymali) Сустрэча з кіраўніком міліцыі Віцебшчыны Грыбам скончылася затрыманьнем » (/news/zatrymanni/item/3743-skonchylasya-zatrymannem)

Вярнуцца ў пачатак (/news/zatrymanni/item/3742-gvalt-da-supratsounika-mus#startOfPageId3742)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https://t.me/Vitebskspring)